# Пясок не толькі для забавы

**Цэнтр пясочнай тэрапіі Sand Art адкрыты ў Гродзенскім абласным інстытуце развіцця адукацыі. Метад пясочнай тэрапіі, які будзе тут выкарыстоўвацца як спалучэнне мастацтва, псіхалогіі і педагогікі, дапаможа рэалізаваць шырокі спектр педагагічных і псіхалагічных задач.**

— На працягу больш як 70 гадоў існавання інстытут вывучае ўсё новае, што існуе ў педагогіцы, і трансліруе гэты вопыт нашым настаўнікам. Пясочная тэрапія — сучасны кірунак работы не толькі з дзецьмі, але і з дарослымі, — гаворыць рэктар ІРА, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Святлана Сяргейка. — Гэты метад дае магчымасць зняць напружанне, пазбавіцца стрэсу, а некаторым, наадварот, разняволіцца. Пясок дазваляе дзіцяці з дапамогай метафарычных вобразаў расказаць аб сваім унутраным свеце.

Цэнтр абсталяваны спецыяльнымі прыладамі для малявання пяском рознага тыпу: каляровым, спецыяльным для малявання на светлых панэлях, кінетычным для лепкі. Ёсць тут і так званая юнгіанская пясочніца, дзе дзеці будуюць свет так, як яны яго ўяўляюць.

— Метад пясочнай тэрапіі — гэта магчымасць размаўляць без слоў. Псіхолагу і педагогу тое, што стварыла дзіця, лепш за ўсякія словы раскажа аб яго стане, — гаворыць старшы выкладчык кафедры псіхолага-педагагічнага суправаджэння адукацыі кіраўнік цэнтра Наталля Касцюк. Дарэчы, Наталля Чаславаўна — псіхолаг па адукацыі, а навучанне метадам пясочнай тэрапіі праходзіла ў Санкт-Пецярбургу.

У першы дзень работы цэнтра прайшлі майстар-класы для дзяцей і дарослых "Прамудрасці пяску". У інстытуце плануюць, што займацца тут будуць дарослыя і дзеці. Сярод паслуг цэнтра пясочнай тэрапіі — псіхалагічнае кансультаванне дзяцей і дарослых, майстар-класы па маляванні пяском для дзяцей і дарослых, сумеснае маляванне дзяцей і бацькоў пяском на светлавым стале, семінары і трэнінгі для псіхолагаў, выхавальнікаў, настаўнікаў-дэфектолагаў.

Заняткі ў цэнтры ўключаны ў курсы павышэння кваліфікацыі педагогаў вобласці. Летам цэнтр будуць наведваць выхаванцы дзіцячых лагераў адпачынку, у жніўні заняткі тут арганізуюць і для слухачоў абласной "Школы маладога настаўніка". Цікавасць да "пясочных" паслуг выказалі прадстаўнікі ўстаноў і арганізацый Гродна, якія прысутнічалі на ўрачыстым адкрыцці цэнтра і прынялі ўдзел у майстар-класах.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
*grodna@ng-press.by*